Валерый Калясінскі

# Выявы замкаў на манетах і медалях
# краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы

Традыцыя выяўляць на манетах і медалях помнікі архітэктуры і асобныя архітэктурныя аб'екты з'явілася яшчэ ў часы антычнасці, атрымаўшы свой найвышэйшы росквіт у Старажытным Рыме. Масавае з'яўленне выяў помнікаў архітэктуры на манетах і медалях супадае з актывізацыяй будаўнічых работ.

У Старажытным Рыме былі распрацаваны тыпы манет і медалёў, якія з'яўляліся ўзорамі медальернага мастацтва ў наступных стагоддзях. На манетах і медалях прысутнічалі выявы архітэктурных аб'ектаў, што мелі абароннае, грамадзянскае і культавае прызначэнне.

Выпуск манет і медалёў па сваім прызначэнні можна ўмоўна падзяліць на два перыяды. Першы перыяд ад антычнасці да пачатку XX стагоддзя характэрызуецца магчымасцю прасачыць не толькі змены ў захаванні асобнай забудовы і нават ландшафту на працягу пэўнага часу, але і разгледзіць на прыкладзе архітэктурных помнікаў стылі, уласцівыя розным эпохам. Выявы на манетах і медалях ідэальна па тых часах папулярызавалі збудаванні, якія мелі вялікую грамадскую значнасць, дэманстравалі будаўнічыя магчымасці.

**Мастацтва антычнасці**

Прыкладам гэтых манет з'яўляецца манета Ісаўры 194–212 гг. На рэверсе – выява дзвюх вежаў з брамай. У цэнтры – постаць сядзячай багіні Тыхе з рогам дастатку. Надпіс пад выявай і па кругу манеты [1].

Нягледзячы на мініяцюрныя памеры манеты, выява дае не толькі ўяўленне аб знешнім выглядзе помнікаў архітэктуры, але і падрабязна перадае характэрныя рысы і нават некаторыя дробязі. Гэта датычыцца і іншых твораў медальернага мастацтва часоў антычнасці.

**Раманскае мастацтва**

З X стагоддзя на землі Беларусі ў вялікай колькасці сталі завозіцца срэбраныя дырхемы з Германіі і Чэхіі. На рэверсе гэтых манет часта фігуруюць выявы ўмацаваных кляштароў, цэркваў, абарончых збудаванняў.

Цікавы дынарый Гільдэсгейма сярэдзіны XI ст. (Германія. Срэбра, дыяметр 20 мм. Эрмітаж). На рэверсе – выява Гельдэсгеймскай царквы Святога Міхаіла з характэрнымі абарончымі вежамі па баках. Зверху выява далоні і надпіс па кругу манеты [2] [іл. 1].

Выява і драўляная мадэль царквы XVII ст. на манеце даюць магчымасць рэканструяваць сярэднявечнае збудаванне царквы, выкананай у раманскім стылі.

Дынарый Оттана III і Адэльгейды (991–1040), які датуецца прыкладна 1002 г., мае схематычную выяву на рэверсе вежы. Па кругу манеты надпіс [3].

Вежа пабудавана вельмі ўмоўна і яе цяжка атрыбуціраваць. Ручны спосаб чаканкі манет не дазваляе ў большасці выпадкаў атрымаць якасную выяву, таму сустракаюцца не да канца прачаканныя месцы па манеце.

**Мастацтва барока**

Пачынаючы з эпохі Адраджэння, выява помнікаў архітэктуры і разгорнутыя панарамы гарадоў, што ўпершыню з'яўляюцца ў медальерным мастацтве ў гэты час, адлюстраваны з дакументальнай падрабязнасцю і на высокім мастацкім узроўні. З'явілася тэхналогія чаканкі манет і медалёў, якая дазваляе вырабляць буйныя срэбраныя і залатыя экземпляры.

Панарамы гарадоў сустракаюцца на польскіх данатыўных манетах, што з'яўляюцца ўзорам высокага медальернага мастацтва. Данатыўныя манеты чаканіліся абмежаванымі тыражамі і прызначаліся ў падарунак ці як узнагарода, гэта набліжала іх да медалёў. Да манет іх далучае вага каштоўнага металу, кратная дукату, талеру.

Данатыва ў два талеры 1629 г. з выявай на рэверсе фрагмента Торуня (Польшча. Торунь. Срэбра, дыяметр 47 мм. Эрмітаж). На рэверсе – від панарамы горада Торуня на беразе Віслы пасля зняцця шведскай асады 16 лютага 1629 г., на што ўказвае полымя над горадам. Бачны фартыфікацыйныя збудаванні [4] [іл. 2].

Данатыва ў дзесяць дукатаў 1644 г. (Польшча. Гданьск. Золата, дыяметр 47,5 мм. Эрмітаж). На рэверсе фрагмент панарамы добра ўмацаванага горада. Бастыёны, сцены і рвы даюць уяўленне пра фартыфікацыйныя збудаванні горада [5] [іл. 3].

Данатыва ў шэсць дукатаў 1645 г. (Польшча. Гданьск. Золата, дыяметр 40,5 мм. Эрмітаж). На рэверсе фрагмент панарамы, які паўтарае выяву з данатыва ў дзесяць дукатаў 1644 г. Невялікія адрозненні сведчаць пра дакументальнасць выяў [6] [іл. 4].

Авальны медаль Яна Энгельгарта прысвечаны віленскаму біскупу Яўстахію Валовічу. 1626 (пазалочанае срэбра, дыяметр 41х35,5 мм. Эрмітаж). На рэверсе панарама Вільні са шматлікімі шпілямі. Злева Ніжні і Верхні замкі, якія даюць дадатковы матэрыял для больш дакладнай рэканструкцыі. Медаль выкананы на высокім мастацкім узроўні і з'яўляецца цікавым помнікам медальернага мастацтва барока [7] [іл. 5].

Медаль невядомага майстра прымеркавана да ўзяцця Смаленска войскамі Сігізмунда III. 1611 (медзь, дыяметр 129 мм. Літоўскі мастацкі музей). На рэверсе дэтальна паказана забудова Смаленска, умацаванага сценамі з вежамі і іншымі фартыфікацыйнымі аб'ектамі. Горад выяўлены падчас штурму, аб чым сведчаць накірункі перамяшчэння войск. Медаль з'яўляецца прыкладам мастацтва барока і вылучаецца дэталёвай прапрацоўкай і дакументальнасцю ў перадачы плана горада [8] [іл. 6].

**Мастацтва XX–XXI стст.**

Юбілейны медаль прысвечаны 400-годдзю ардынацыі князёў Радзівілаў у Нясвіжы. Аўтар Ігнацій Урублеўскі. 1913 (срэбра, дыяметр 68 мм. Эрмітаж). На рэверсе ў цэнтры – выява ўязной брамы замка Радзівілаў у Нясвіжы і фрагменты забудовы [9] [іл. 7]. З другой паловы XX стагоддзя пачынаецца другі перыяд, калі манеты і медалі выпускаюцца ў асноўным як сувенірныя. Выявы абарончых збудаванняў прадстаўлены часта паводле рэканструкцыі, і выпускі іх уваходзяць у тэматычную серыю. У афармленні прысутнічаюць абарончыя збудаванні розных стыляў.

У медальерным мастацтве XX ст. традыцыя выяўляць замкі захавалася як пазнавальны сімвал дзяржавы і нацыянальнае багацце.

У Эстоніі ў 1930 г. была адчаканена са срэбра курсавая манета наміналам у дзве кроны. На рэверсе выява Вышгарадскай крэпасці (Тоомпеа) у Таліне.

Латвія адчаканіла ў 1997 г. манету-медаль са срэбра вартасцю 10 лат з выявай на аверсе плана цэнтра Рыгі XVII ст.

Літва ў 1998 г. выпусціла манету-медаль са срэбра вартасцю 5 літ “ЮНІСЭФ – Дзеці свету”. На аверсе выява верхняга замка ў Вільні.

Славенія ў 1997 г. адчаканіла манету-медаль са срэбра вартасцю 200 крон з нагоды ўключэння цэнтра Баскай Стаўніцы ў ЮНЕСКА.

Чэхія ў 1993 г. выпускае ў абарачэнне курсавую манету з меднага сплаву вартасцю 50 крон, з выявай цэнтра Прагі. З 1997 г. выпускаюцца манеты палепшанай якасці для калекцыянераў.

У Расіі ў 1995 г. адчаканена манета-медаль вартасцю 3 рублі са срэбра “Смоленский кремль XI–XVIII вв.”, “1000 России. Александр Невский. Новгородский кремль”. У 1997 г. выйшла серыя манет-медалёў вартасцю 3 рублі са срэбра: “Монастырь Коренной Рождество-Богородицкий пустыни. Курск. 1597”, “Свято-Введенский монастырь. Ярославль. 1314”, “850-летие основания Москвы”, “Соловецкий монастырь XV в.”.

5 рублёў 1997 г. “Сергиев Посад XIV—XVIII вв.”.

3 рублі – 1998 г.: “Нило-Сталобинская пустынь”, “Славино-Сторожевский монастырь. Звенигород”; 1999 г.: “Юрьев монастырь. XII век. Новгород”; 2000 г.: “Николо-Утрешский монастырь”, “Нижегородский кремль XVI в.”.

Серыя манет-медалёў “Манастыры і крамлі Расіі”, адчаканеная са срэбра, дае ўяўленне пра знешні выгляд гэтых унікальных помнікаў дойлідства Расіі.

Польшча ў 1975 г. адчаканіла манеты-медалі са срэбра вартасцю 100 злотых: “Замак каралеўскі. Варшава”, 1977 г. – “Замак каралеўскі на Вавелі”. 1993 г. – курсавая манета 20000 злотых “Замак у Ланцуце”, медна-нікелевы сплаў; манета-медаль вартасцю 300000 злотых “Замак у Ланцуце”, срэбра; манета-медаль вартасцю 300000 злотых “Сусветны помнік культуры

ЮНЕСКА – 1992. Замосце”, срэбра; 1996 г. – манета-медаль вартасцю 20 злотых “IV стагоддзі сталічнай Варшавы”, срэбра; манета-медаль вартасцю 20 злотых “Замак у Лідзбарку-Вармінскім”, срэбра. Падобная па кампазіцыі курсавая манета наміналам 2 злотыя з металу жоўтага колеру (N. G.) “Nordic Gold” Cu Al 5 Zn 5 Sn 1/alloy (дадзеныя буклета); 1997 г. – манета-медаль вартасцю 20 злотых “Замак у Пясковай Скале”, срэбра; курсавая – 2 злотыя “N. G.”; 1998 г. — манета-медаль вартасцю 20 злотых “Замак у Корніку”; курсавая – 2 злотыя “N. G.”; 2002 г. — “Замак у Мальборку” 20 злотых, срэбра; курсавая – 2 злотыя “N. G.” [іл. 8].

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне манеты-медалі з выявамі асобных збудаванняў, архітэктурных комплексаў, панарам гарадоў, якія ўваходзяць у серыю “Гарады Беларусі” і “Помнікі архітэктуры Беларусі”. Асаблівае месца займаюць манеты-медалі з выявамі замкаў, цэркваў-крэпасцей і іншымі помнікамі абарончага дойлідства.

Серыю “Гарады Беларусі” адкрываюць манеты-медалі, прысвечаныя Полацку. На рэверсе выява Полацкага Верхняга і Ніжняга замкаў з вядомай гравюры Я. Баптысты. Уверсе герб Полацка. Надпіс /ПОЛАЦК. ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 21 кастрычніка 1998 г. Дызайнер Таццяна Радзівілка [10].

Манеты-медалі, прысвечаныя Мінску. На рэверсе выява Езуіцкага калегіума з касцёлам і брамы мінскага замка паводле рэканструкцыі Ю. Зайца. Уверсе выява герба горада Мінска. Надпіс /МІНСК. ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 4 студзеня 1999 г. Дызайнер Таццяна Радзівілка [11] [іл. 9].

Манеты-медалі, прысвечаныя Магілёву. На рэверсе фрагмент панарамы Магілёва паводле гравюры XVIII ст. Уверсе выява герба горада Магілёва. Надпіс /МАГІЛЁЎ. ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 12 ліпеня 2004 г. Дызайнер Святлана Заскевіч [12] [іл. 10].

Серыя “Помнікі архітэктуры Беларусі” пачынаецца з манет-медалёў з выявай Мірскага замка. На рэверсе – тры вежы заходняй сцяны ў тры чвэрці. Справа ўмоўны абрыс чацвёртай вежы і лічбы /XVI—XVII/. Надпіс /ПОМНІКІ/ /АРХІТЭКТУРЫ/ /БЕЛАРУСІ/ і /МІРСКІ ЗАМАК/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 29 снежня 1998 г. Дызайнер Таццяна Радзівілка [13] [іл. 11].

Манеты-медалі з выявай царквы-крэпасці ў Сынкавічах. На рэверсе выява царквы-крэпасці ў тры чвэрці. Злева лічбы /XV—XVI/. Надпіс /ПОМНІКІ/ /АРХІТЭКТУРЫ/ /БЕЛАРУСІ/ і /ЦАРКВА-КРЭПАСЦЬ/ /СЫНКАВІЧЫ/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-

нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 16 кастрычніка 2000 г. Дызайнер Таццяна Радзівілка [14] [іл. 12].

Манеты-медалі з выявай камянецкай вежы. На рэверсе выява камянецкай вежы. Злева лічба /XIII/. Надпіс /ПОМНІКІ/ /АРХІТЭКТУРЫ/ /БЕЛАРУСІ/ /КАМЯНЕЦКАЯ ВЕЖА/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 20 снежня 2001 г. Дызайнер Святлана Заскевіч[15] [іл. 13].

Манеты-медалі з выявай замка Радзівілаў у Нясвіжы. На рэверсе – карпусы нясвіжскага замка. Уверсе лічбы /XVI—XIII/. Надпіс /ПОМНІКІ/ /АРХІТЭКТУРЫ/ /БЕЛАРУСІ/ і /ЗАМАК/ /РАДЗІВІЛАЎ/ /НЯСВІЖ/. Намінал 20 рублёў са срэбра і адзін рубель з медна-нікелевага сплаву. Уведзены ў абарачэнне 16 лістапада 2004 г. Дызайнер Святлана Заскевіч [16] [іл. 14].

Двухбаковы аўтарскі медаль прысвечаны ўключэнню замкавага комплекса “Мір” у 2000 г. у Спіс помнікаў Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. На аверсе медаля франтальная выява заходняй сцяны з вежамі. Уверсе тры гербы. Надпіс /·МІР · ЗАМАК · 1495·/ /·БЕЛАРУСЬ·/. Па краі выступаючы кант. 2002. Бронза, дыяметр 119 мм. Аўтар Леў Талбузін [17] [іл. 15].

* * *

У часы антычнасці і сярэднявечча з нагоды пабудовы замкаў іх выявы змяшчаліся на медалях і манетах. З цягам часу замкі змянілі сваю абаронную функцыю і ператварыліся ў музейныя і турыстычныя аб’екты як сведкі гістарычных падзей і помнікі вайскова-архітэктурнай спадчыны. Выкарыстанне выяў замкаў і абарончых збудаванняў на манетах і медалях павінна спрыяць знаёмству з імі ў свеце і выклікаць цікавасць і намаганне па іх захаванні. Асобныя аб’екты становяцца пазнавальнымі сімваламі краіны. Ёсць усе падставы на спадзяванне, што такія выявы і надалей будуць з’яўляцца на манетах і медалях многіх краін свету. Рэспубліка Беларусь займаецца прэзентацыяй сваёй архітэктурнай спадчыны праз манеты-медалі і медалі, якія арганічна ўваходзяць у культурную прастору Еўропы.



*1. Дынарый Гільдэсгейма. Сярэдзіна XI ст.*



*2. Двайны талер. 1629. Торунь.*



*3. Данатыва ў 10 дукатаў. 1644. Гданьск.*



*4. Данатыва ў 6 дукатаў. 1645. Гданьск.*



*5. Медаль віленскага біскупа Яўстахія Валовіча. 1626.*



*6. Медаль на ўзяцце Смаленска. 1611.*



*7. Юбілейны медаль, прысвечаны 400-годдзю ардынацыі князёў Радзівілаў у Нясвіжы. 1913.*



*8. Манета. Замак у Мальборку. 2 злотыя. 2002.*




*9. Манета-медаль. Мінск. Гарады Беларусі. 1999.*




*10. Манета-медаль. Магілёў. Гарады Беларусі. 2004.*




*11. Манета-медаль. Мірскі замак. Помнікі архітэктуры Беларусі. 1998.*




*12. Манета-медаль.
Царква-крэпасць Сынковічы.
Помнікі архітэктуры Беларусі. 2000.*




*13. Манета-медаль. Камянецкая
вежа. Помнікі архітэктуры
Беларусі. 2001.*




*14. Манета-медаль. Замак
Радзівілаў. Нясвіж.
Помнікі архітэктуры Беларусі.
2004.*




*15. Медаль. Мір. Замак.
2002. Фарфор.*

Літаратура:

1. Абрамзон М.Г. Монеты как средство пропаганды официальной политики Римской Империи. – М., 1995.— С. 622.
2. Потин В. Европейские редкие монеты. Из нумизматичекой коллекции Эрмитажа //Аврора. Ленинград.1972. 16 открыток
3. Зварич В.В. Нумизматический словарь // Львов изд. объед. «Вища школа». 1979. – № 79.
4. Потин В. Европейские редкие монеты…
5. Там жа.
6. Там жа
7. RUZAS V. LIETOVA MEDALIVOSE XVI a–XX a. Pradzia VILNIUS. 1998. — С. 68–69.
8. Там жа. С. 82–83.
9. Там жа. С. 198–199.
10. Буклет-справочник «Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь 1992—2003». Национальный банк Республики Беларусь. – Мн., 2003. — С. 74.
11. Там жа. – С. 76.
12. Банкаўскі веснік. 2004. Ліпень.
13. Буклет-справочник «Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь 1992—2003». Национальный банк Республики Беларусь. – Мн., 2003. — С. 82.
14. Там жа. С. 86.
15. Там жа. С. 88.
16. Банкаўскі веснік. 2004. Лістапад.
17. Калясінскі В.Ф. Медальернае мастацтва ў творчасці Льва Іванавіча Талбузіна // 1 Няфёдаўскія чытанні. Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць. Зб. матэрыялаў Міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі (Мінск, 18–19 лютага 2003 г.). — Мн., 2004. – С. 375.